# «ЦВЯТОК РАДЗІМЫ ВАСІЛЬКА...»

***Менавіта гэтая кветка, брэнд фестывальнага Віцебска і нашага рэгіёна ў цэлым, была абарана сімвалам абласнога моладзевага навагодняга балю, які адбыўся ў сярэдзіне снежня.***

Васільковая тэма прасочвалася ў афармленні інтэр'ераў рэстарана «Паўночная сталіца», фотазон, ва ўборах і аксэсуарах удзельнікаў. Запрашэнні на святочнае мерапрыемства атрымалі стыпендыяты, выдатнікі вучобы, члены Моладзевай палаты, пераможцы канферэнцый, алімпіяд, конкурсаў і спаборніцтваў. Запрашальны ліст на навагодні баль стаў для мяне прыемнай нечаканасцю. Ва ўніверсітэце мы загаддзя пачалі рэпетыцыі, я вывучыла новыя цікавыя танцы: польку, паўночную кадрыль, вальс і іншыя. Дзякуючы таленавітым харэографам ВДУ, навука давалася нам лёгка. Яшчэ я разам са сваёй сям'ёй дэталёва прадумвала вобраз на вечар: ад сукенкі да прычоскі. Дарэчы, сукенку светла-васільковага колеру мы пашылі самі.

Вось і настаў гэты дзень. Скажу шчыра, я вельмі хвалявалася, але як толькі пераступіла парог рэстарана, адразу супакоілася, бо патрапіла ў чароўную атмасферу сярэдневяковага дваранскага балю з танцамі і жывой музыкай.

«Гледзячы на дзяўчат у прыгожых сукенках і кавалераў у строгіх касцюмах, слухаючы музыку мінулых стагоддзяў, мы як быццам перанесліся ў Сярэднявечча. Было цікава развучваць танцы і выступаць, адначасова і хвалявацца, і захапляцца святочнай атмасферай», – адзначыў студэнт 3 курса факультэта хіміка-біялагічных і геаграфічных навук **Яўген ШАПЛЯКОЎ.**

Дарэчы, такое мерапрыемства для моладзі можна смела назваць традыцыйным. Свята ў стылі балю 18 – 19 стагоддзяў паспяхова праходзіць у Віцебску ўжо трэці год запар.

«Баль даў нам выдатную магчымасць адчуць перадднавагодні настрой і хаця б на вечар забыць пра будучую сесію. Усё было цудоўна: аркестр, танцы, галасы выканаўцаў. Я адчувала сябе сапраўднай прынцэсай. Дзякуй за гэтае свята», – падзялілася ўражаннямі студэнтка 2 курса мастацка-графічнага факультэта **Сафія СЕМЯНЮК.**

Завяршылася свята абменам падарункамі і феерверкам. А на памяць пра баль у нас засталіся яркія ўражанні і прыгожыя здымкі.



**Дзіяна ГАЛАВАЧ,**
**студэнтка 3 курса ФГІМК.**
**Фота Дзмітрыя Осіпава.**